**Зінкевіч, А.** Вайны жорсткае аблічча / А. Зінкевіч // Веснік Глыбоччыны. — 1999. — 18 снежня. — С. 2.

## ВАЙНЫ ЖОРСТКАЕ АБЛІЧЧА

20 гадоў таму, у снежні 1979 года першыя савецкія воіны ступілі на зямлю Афганістана. Менавіта з уводам вайсковых фарміраванняў у гэтую краіну і распачалася неаб'яўленая вайна. Вайна, якая, толькі ўдумайцеся, доўжылася ў два разы больш, чым Вялікая Айчынная. Вайна, якая стала адначасова гераічнай і трагічнай старонкай у нашай гісторыі. Вайна, раны якой і цяпер крываточаць. А боль, фізічны і душэўны боль, не дае спакою колішнім салдатам-«афганцам», іх матулям, родным і блізкім.

Сёння тым самым юным, хто тады аказаўся на чужыне, і потым вярнуўся дадому, ужо без малога сорак. Узрост салідны. У лёсе кожнага з іх вайна пакінула сваю адмеціну. З вышыні часу пражытае бачыцца выяўней. Што так, то так. Зрэшты, паслухаем, што аб гэтым гаворыць **Антон Пятровіч ЖДАНОВІЧ**, начальнік раённага аддзела аб'яднання «Ахова» пры МУС РБ, старшыня раённай арганізацыі грамадскага аб'яднання «Беларускі саюз ветэранаў вайны ў Афганістане». Днямі наш карэспандэнт сустрэўся з ім і задаў некалькі пытанняў.

*– Антон Пятровіч, Вы былі ў ліку першых нашых салдат, якіх накіравалі ваяваць у далёкую горную краіну. Калі можна, успомніце, як гэта было для Вас асабіста? Што адчувалі тады?*

– Служыў я ў паветрана-дэсантных войсках. Вучоба ў школе малодшых камандзіраў праходзіла ў дывізіі, расквартараванай на тэрыторыі Літвы. Пасля, у красавіку 1979 года, трапіў у Туркестанскую ваенную акругу. Ёсць такі горад Чырчык у сарака кіламетрах ад Ташкента. Вось тут і атрымаў усебаковую падрыхтоўку па вядзенню баявых дзеянняў ва ўмовах гарыстай мясцовасці. Ужо тады для нас не было сакрэтам, што неўзабаве можам апынуцца там, у Афганістане. 25 снежня быў аддадзены загад аб уводзе кантынгента нашых войск у гэтую краіну. У дэсантнікаў, як вядома, ёсць прывілея – знаходзіцца заўседы на першым рубяжы.

Спачатку мы выступілі на баку «амінаўцаў». Мясцовае насельніцтва сустракала нас прыязна, праводзіліся мітынгі. Затым, пасля 27 снежня, калі расстралялі Аміна, сітуацыя пачала мяняцца. Хуткага завяршэння аперацыі, як планавалі тагачасныя нашы палітыкі, не атрымалася. Да вясны асабліва шырокіх ваенных дзеянняў не вялося. Узнікалі асобныя сутычкі. А пасля душманы актывізаваліся. Адчувалася, што сіла іх расце прапарцыянальна аказваемай усебаковай дапамозе з-за мяжы. Баі ўжо зацягваліся на тыдзень і болей. У маджахедаў выпрацоўвалася свая тактыка. У гарах яны сябе адчувалі, як рыба ў вадзе. Нашы вайсковыя злучэнні базіраваліся, у асноўным, гарнізонамі і блок-пастамі.

Узіраючыся ў сённяшнюю тэлехроніку вайны ў Чачні, параўноўваю з нашымі дзеяннямі ў Афганістане. Шмат падобнага. Мы таксама блакіравалі населеныя пункты, рабілі іх зачыстку. Як бы там ні было, а ў вайны твары падобныя, жорсткія. Нямала давялося прайсці па бездарожжы афганскай вайны. Забяспечвалі пераправу праз Аму-Дар'ю, ахоўвалі трубаправод нафтапрадуктаў, суправаджалі караваны ваеннай тэхнікі і г.д.

*– Паняцце «інтэрнацыянальны абавязак» досыць распаўсюджанае. Як Вы ацэньваеце яго цяпер?*

– Да 1983 года наша афіцыйная прапаганда вайну ў Афганістане ніяк іначай не называла, як «вучэбныя баі з умоўным праціўнікам». Ці яшчэ так: «Аказваецца дапамога дружалюбнаму афганскаму народу». Вось з гэтым ніяк не хацелася пагаджацца. Хаця ўсе мы былі перакананы ў тым, што прысутнасць савецкіх войск там – абавязковая, бо нельга ж было дапусціць «натаўцаў» да рубяжоў сваёй краіны.

У асяродку салдат панаваў, як кажуць, здаровы баявы дух. Маладыя хлопцы падавалі заявы на ўступленне ў партыю, у камсамол са словамі: «Хачу ісці ў бой камуністам...»

*– Мяркую, на вайне асаблівае гучанне, глыбокі сэнс набываюць такія паняцці, як «сяброўства», «дружба», «радзіма» і г.д.*

– Бясспрэчна, у Афганістане выкрышталізоўвалася наша ваеннае братства. Памяць аб родных людзях, аб краі сваім заўсёды зберагі ў сэрцах.

Вайна працягвалася. Адны вярталіся дамоў, другія заступалі. Не ўсім пашанцавала застацца ў жывых. Вечная ім памяць. На панамах многіх беларусаў, і на маёй таксама, красаваўся надпіс «Белая Русь». Дзякуючы гэтым словам, жыла памяць аб радзіме, па-гэтаму здаля пазнавалі на вайне землякоў. Дарэчы, у тых мясцінах, дзе служыў я, ужо пазней ваявалі і нашы хлопцы-глыбачане Аляксандр Бародзіч і Юрый Обух.

*– Якую ролю адыгрывае ў жыцці былых воінаў-інтэрнацыяналістаў раённая арганізацыя грамадскага аб'яднання «Беларускі саюз ветэранаў вайны ў Афганістане?»*

– Не хацелася б мне як старшыні гэтай арганізацыі даваць нейкую ацэнку нашай рабоце. Скажу так, трымаемся адзін аднаго. У меру нашай кампетэнцыі аказваем юрыдычную дапамогу. Менавіта праз арганізацыю накіроўваем хлопцаў у рэспубліканскі рэабілітацыйны цэнтр. Шкада, не ўсе пуцёўкі чамусьці цяпер выкарыстоўваюцца. Прыцягваем былых воінаў-«афганцаў» да ўдзелу ў грамадскім жыцці раёна, у патрыятычным выхаванні моладзі.

*– Дзякую Вам за гутарку, Антон Пятровіч, поспехаў Вам і раённай арганізацыі воінаў-«афганцаў».*

А. Зінкевіч